ТВОРЧЫЯ СУСТРЭЧЫ

# Калі радок дыктуе пачуццё...

**У Пінскім гарадскім Доме культуры адбыўся вечар музыкі і паэзіі «Радок і пачуцці». На сустрэчу з узвышаным светам лірыкі і натхнення прыйшлі многія жыхары культурнай сталіцы Беларусі.**

У музычна-паэтычнай сустрэчы паўдзельнічалі вядомы паэт, празаік, перакладчык, крытык і публіцыст Міхаіл Пазднякоў і паэт, празаік, член пісьменніцкіх суполак Беларусі і Расіі, лаўрэат творчых конкурсаў Валянціна Паліканава. Яны з задавальненнем пазнаёмілі публіку са сваімі творамі. Песні на вершы паэтаў выканаў пінчанін, спявак і кампазітар Віктар Мяцельскі. Дарэчы, ён паспяхова супрацоўнічае з многімі літаратарамі, толькі за апошні год стварыў амаль 60 песен.

**Наталля МІЛЕЎСКАЯ**